Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

19 МАЯ 2007 г. СУБОТА

№ 91 (25956)

Кошт 350 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## Будаўніцтва адміністрацыйна-дзелавога і грамадскага цэнтра «Мінск-Сіці» плануецца пачаць у 2009 годзе

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 18 мая заслухаў даклад аб рэалізацыі генеральнага плана развіцця сталіцы. Мерапрыемства адбылося ў Мінскай гарадской ратушы.**

Галоўны архітэктар горада Мінска Віктар Нікіцін дэталёва праінфармаваў кіраўніка дзяржавы аб перспектывах развіцця сталіцы. Размова атрымалася грунтоўная і выйшла далёка за рамкі абазначай тэматыкі.

Аляксандр Лукашэнка адобрыў канцэпцыю будаўніцтва адміністрацыйна-дзелавога і грамадскага цэнтра і жылога раёна «Мінск-Сіці», які будзе створаны на месцы аэрапорта Мінск-1 і Мінскага авіярамонтнага завода, якія выносяцца за межы сталіцы.

Прэзідэнт запатрабаваў пачаць будаўніцтва аб'ектаў цэнтра ўжо ў 2009 годзе, адразу пасля завяршэння першай чаргі праектных работ. «Неабходна як мага хутчэй падрыхтаваць праекты і прапанаваць іх інвестарам, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Будаваць трэба пачынаць хутка, не зацягваючы гэты працэс».

Галоўны архітэктар сталіцы падкрэсліў, што вынас аэрапорта з горада з'яўляецца актуальным пытаннем для Мінска. Цяпер асваенне тэрыторый, прылеглых да аэрапорта Мінск-1, вядзецца з вялікай колькасцю санітарна-гігіенічных і вышынных абмежаванняў. У зоне ўзлётна-пасадачнай паласы аэрапорта і падыходаў да яе знаходзіцца каля 860 гектараў гарадскіх тэрыторый.

Паводле слоў Віктара Нікіціна, вынас аэрапорта Мінск-1 і авіярамонтнага завода за межы горада дасць магчымасць сфарміраваць і рэканструяваць на якасна новым узроўні забудову сталіцы на тэрыторыях, якія знаходзяцца ў зонах абмежавання па паверхавасці будынкаў або забароны на будаўніцтва ў сувязі з палётамі самалётаў. Гэта таксама дасць магчымасць дадаткова пабудаваць больш як 300 тыс.кв. метраў жылля ў раёне Лошыцы, каля 500 тыс.кв. метраў жылога фонду па праспекце Дзяржынскага. Віктар Нікіцін падкрэсліў, што рэалізацыя гэтага праекта разглядаецца ў агульнай сістэме развіцця сталіцы і будаўніцтва трэцяй лініі метро працягласцю 5,5 км з пяццю станцыямі.



Фота БЕЛТА.

У цэлым рэалізацыя гэтага праекта дасць магчымасць пабудаваць сучасны жылы раён з насельніцтвам 35—38 тыс. чалавек, сфарміраваць сучасны адміністрацыйна-дзелавы грамадскі цэнтр з комплексам вышынных будынкаў «Мінск-Сіці», прадугледзець тэрыторыю для будаўніцтва будынкаў замежных дыппрадстаўніцтваў (плошча 24 га).

Прэзідэнта праінфармавалі аб тым, што праектам будзе прадугледжана стварэнне новай транспартнай інфраструктуры, увязанай з будаўніцтвам трэцяй лініі метрапалітэна, аб'яднанай перасадачнымі вузламі з існуючымі лініямі.

Пры распрацоўцы гэтага праекта ўлічаны сусветны вопыт стварэння аналагічных цэнтраў у буйных еўрапейскіх гарадах. Такі падыход дае магчымасць актыўна выкарыстоўваць новыя тэхналогіі і весці будаўніцтва будынкаў практычна без абмежаванняў іх вышыні.

Прэзідэнта праінфармавалі аб тым, што ў шматфункцыянальны дзелавы цэнтр плануецца ўключыць кварталы грамадскіх будынкаў, дзяржаўных устаноў, міністэрстваў, спартыўныя комплексы, цэнтры адпачынку. Як плануецца, у цэнтры будзе знаходзіцца плошча з 70—80-павярховым будынкам — сімвалам горада. Абмяркоўвалася пытанне стварэння ў адным з новых будынкаў кангрэс-хола для правядзення маштабных міжнародных мерапрыемстваў.

Аляксандр Лукашэнка адобрыў унесеныя прапановы і адзначыў, што праект павінен рэалізавацца паэтапна і з прыцягненнем інвестыцый.

Забудова адміністрацыйна-дзелавога і грамадскага цэнтра, жылога раёна «Мінск-Сіці», які будзе створаны на вызваленых тэрыторыях, пачнецца ўжо ў 2009 годзе, таму неабходна на працягу 2—3 гадоў вынесці за межы сталіцы авіярамонтны завод. Прэзідэнт падкрэсліў, што павінна быць пабудавана новае сучаснае прадпрыемства. Пры гэтым, як адзначыў кіраўнік дзяржавы, абавязкова павінен быць захаваны кадравы патэнцыял, высокакваліфікаваныя спецыялісты. «Мы павінны захаваць рабочыя месцы і паклапаціцца пра людзей», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы лічыць, што ў Беларусі неабходна захаваць авіярамонтную вытворчасць і з гэтай мэтай цяпер ужо трэба весці перагаворы з замежнымі кампаніямі аб стварэнні сумеснага прадпрыемства. Размова можа ісці аб супрацоўніцтве з сусветнымі авіябудаўнічымі кампаніямі.

На сустрэчы абмяркоўвалася выкананне даручэнняў Прэзідэнта па развіццю гістарычнага цэнтра горада.

Прэзідэнт даручыў падрыхтаваць прапановы па стварэнню сучаснага Нацыянальнага выставачнага цэнтра Беларусі. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў новым комплексе павінны быць як пастаянна дзеючыя, так і часовыя экспазіцыі.

У ходзе даклада галоўны архітэктар горада праінфармаваў аб намерах па будаўніцтву новых шматузроўневых падземных паркінгаў.

Размова ішла таксама аб планах па рэканструкцыі Кастрычніцкай плошчы. Прэзідэнт Беларусі лічыць, што неабходна вельмі грунтоўна падыходзіць да разгляду гэтых праектаў: «Тут нельга зыходзіць толькі з камерцыйных інтарэсаў. Кастрычніцкая плошча — гэта ў першую чаргу зона адпачынку. Нельга таксама выпускаць з-пад увагі ідэалагічныя і палітычныя аспекты гэтага месца».

У ходзе даклада абмяркоўвалася таксама пытанне будаўніцтва пяцізоркавага атэля замежнымі інвестарамі на вуліцы Інтэрнацыянальнай недалёка ад Кастрычніцкай плошчы. Гэта будзе вышынны будынак, узведзены па самых сучасных тэхналогіях.

Кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на прыцягненні інвестараў для рэалізацыі праектаў па развіццю беларускай сталіцы, на выкарыстанні вопыту будаўніцтва замежных кампаній. Трэба прыцягваць тых замежных будаўнікоў, якія зарэкамендавалі сябе хуткімі тэмпамі ўзвядзення аб'ектаў і высокай якасцю, беларусам трэба пераймаць вопыт іх работы. «Нам выгадна прыцягваць такіх інвестараў, якія будуюць хутка і добра», — сказаў Прэзідэнт.

У ходзе даклада абмяркоўвалася таксама пытанне стварэння аўтастаянак на асноўных уязных магістралях у Мінск, якімі маглі б карыстацца госці сталіцы.

Прэзідэнт запатрабаваў, каб будынкі і тэрыторыі як у цэнтры Мінска, так і на ўскраінах горада ўтрымліваліся ва ўзорным парадку. Узвядзенне новабудоўляў павінна ўпрыгожваць сталіцу, а не псаваць яе выгляд. Пры выкарыстанні сучасных напрамкаў у архітэктуры і дызайне не павінен страчвацца нацыянальны каларыт.

Аляксандр Лукашэнка даручыў мэру Мінска навесці належны парадак у раёне кальцавой дарогі, якая з'яўляецца своеасаблівым абліччам горада.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Запрашальнік

## КСЮШЫН ДЗЕНЬ

Традыцыя адзначаць дзень нараджэння не ў вузкім коле родных і сяброў, а шумна і масава, прыжылася ў артыстычным коле. Прычым следам за дарослымі, якія наладжваюць тэматычныя тусоўкі, пацягнуліся і юныя артысты. Ксюша Сітнік збіраецца святкаваць 12-годдзе ні многа ні мала — у сучасным парку забаў «Dreamland». 20 мая з 13 гадзін да позняга вечара запланавана вялікая музычна-забаўляльная праграма.

У рамках святкавання, дарэчы, адбудзецца прэзентацыя новага кліпа юнай спявачкі — «Простая песенька». Гэты відэаролік падарылі пераможцы дзіцячага «Еўрабачання-2005» бацькі.

Нягледзячы на тое, што яшчэ некалькі дзён таму ў дзяўчынкі была высокая тэмпература, зараз Ксюша настроена бадзёра. Сваім гасцям яна збіраецца падарыць канцэрт у дзвюх частках: «дзіцячай» (дзе, акрамя імянінніцы, выступяць Андрэй Кунец, Саша Салавейчык, шоў-балет Alexix)і «дарослай» (калегу павіншуюць Саша Нема, Галіна Шышкова, гурт «Дразды», Пётр Елфімаў, Віктар Пшанічны, Леанід Вайтовіч і іншыя). Завершыцца праграма феерверкам.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## ПІЯНЕРЫЯ ЎСІХ ПАКАЛЕННЯЎ, СВЯТКУЙ!

### Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў піянераў усіх пакаленняў з 85-годдзем піянерскага руху

«На працягу ўсёй гісторыі піянерскі рух выхаваў у мільёнаў дзяцей лепшыя чалавечыя якасці. Навучыў пераадольваць любыя цяжкасці і цяжар, не страчваць годнасці, быць вернымі ідэалам праўды і справядлівасці», — гаворыцца ў віншаванні.

Сёння Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя, якая стала адным з самых буйных дзіцячых грамадскіх аб'яднанняў у рэспубліцы, налічвае ў сваіх радах больш як 500 тысяч дзяўчынак і хлопчыкаў. Гэта цудоўная школа выхавання моладзі ў духу любові і адданасці Радзіме, адзначаецца ў віншаванні.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў піянерам усіх пакаленняў юнацкага запалу, творчага натхнення, надзейных сяброў, удачы і шчасця.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**



IX Рэспубліканскі турыстычны злёт праходзіць у Маладзечанскім раёне.

Фота БЕЛТА

Ва ўрадзе

## Не толькі ганарова, але і прыбыткова

**Пераможцы спаборніцтва 2006 года, занесеныя на рэспубліканскую Дошку гонару, атрымаюць матэрыяльнае заахвочванне. Такое рашэнне змяшчаецца ў праекце пастановы ўрада ў мэтах выканання ўказа Прэзідэнта ад 30 красавіка 2007 года № 204 «Аб занясенні на рэспубліканскую Дошку гонару пераможцаў спаборніцтва 2006 года», паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве эканомікі.**

Дакумент распрацаваны з удзелам Міністэрства фінансаў, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, Міністэрства юстыцыі і змяшчае прапановы па крыніцах і парадку прэміравання пераможцаў спаборніцтва.

У праекце пастановы прадугледжваецца выдзяленне сродкаў з рэспубліканскага бюджэту. Яны будуць накіраваны на матэрыяльнае заахвочванне пераможцаў спаборніцтва за дасягненне ў 2006 годзе найлепшых вынікаў у выкананні прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Нагадаем, што рэспубліканская Дошка гонару адкрыта 1 мая ў Мінску. На яе занесены назвы прадпрыемстваў розных галін народнай гаспадаркі, якія сталі пераможцамі спаборніцтва за дасягненні ў 2006 годзе найлепшых вынікаў у выкананні асноўных мэтавых паказчыкаў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі.

## Падпісанне пагаднення перанесена

**Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў Апараце Савета Міністраў Беларусі, запланаванае на 18 мая падпісанне пагаднення аб куплі-продажы «Газпрамам» 50 працэнтаў акцый ААТ «Белтрансгаз» перанесена.**

Ва ўрадзе адзначаюць, што «падпісанне пакетаў па стварэнню сумеснай беларуска-расійскай газатранспартнай арганізацыі на базе ААТ «Белтрансгаз» пераносіцца на больш позні перыяд у сувязі з неабходнасцю дадатковага ўзгаднення аднаго з падпунктаў куплі-продажу ААТ «Газпрам» акцый ААТ «Белтрансгаз». Для правядзення перагавораў у Мінск прыбывае дэлегацыя ААТ «Газпрам», якую ўзначальвае намеснік старшыні праўлення Валерый Голубеў, праінфармавалі ў Апараце Савета Міністраў Беларусі.

Агенцтва «Інтэрфакс» са спасылкай на Агенцтва газавай інфармацыі паведамляе, што афіцыйны прадстаўнік «Газпрама» Сяргей Купрыянаў заявіў наступнае: у «Газпраме» разлічваюць, што «ў раней вызначаныя тэрміны — да 1 чэрвеня ўсе неабходныя дакументы будуць падпісаны».

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

Актуальнае інтэрв'ю

## ЗЯМЛЯ НАБЫВАЕ РЭАЛЬНЫ КОШТ

***У сувязі з уступленнем у сілу ўказа № 213 «Аб некаторых пытаннях перадачы зямельных участкаў у прыватную ўласнасць грамадзянам Рэспублікі Беларусь», жыхароў краіны цікавіць, як і колькі яны будуць плаціць за зямельныя ўчасткі з улікам кадастравай ацэнкі. Аб гэтым расказаў намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Андрэй ГАЕЎ.***

**— Андрэй Анатольевіч, з 1 студзеня 2007 года ў Беларусі спынілася перадача зямельных участкаў з дзяржаўнай уласнасці ў прыватную ўласнасць грамадзян па нарматыўных цэнах. Цяпер галоўны крытэрый — кадастравая ацэнка зямлі. Ці датычацца гэтыя новаўвядзенні тых зямель, якія былі перададзены людзям раней?**

— Сапраўды, раней пры адчужэнні зямельных участкаў, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, у прыватную ўласнасць грамадзян выкарыстоўвалі льготную або нарматыўную цану. Нагадаю, што льготная цана прымянялася пры перадачы зямельных участкаў у прыватную ўласнасць толькі тым грамадзянам, якія мелі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, для будаўніцтва або абслугоўвання жылога дома. Па льготнай цане да 1 студзеня 2000 года зямельныя ўчасткі выкуплялі грамадзяне, якія атрымалі іх у валоданне і карыстанне да 16 чэрвеня 1993 года. Згодна з новай рэдакцыяй праекта Кодэкса аб зямлі, гэтым грамадзянам будзе вернута права на атрыманне свайго зямельнага ўчастка па льготнай цане. І афармляць права на землекарыстанне зямельным участкам па кадастравым кошце ім не трэба. Ільготная цана на зямлю прымяняецца і цяпер, але толькі ў тых выпадках, калі размова ідзе аб тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў у адпаведнасці з жыллёвым заканадаўствам.

Асноўнымі фактарамі вызначэння нарматыўных цэн на зямельныя ўчасткі з'яўляліся прыродная ўрадлівасць глеб, месцазнаходжанне адносна адміністрацыйных цэнтраў раёнаў, а таксама адміністрацыйны статус населенага пункта. У гарадах і пасёлках гарадскога тыпу нарматыўныя цэны не дыферэнцыраваліся і ўстанаўліваліся ў цэлым на населены пункт. Напрыклад, нарматыўная цана на зямельныя ўчасткі, якія набываюцца ў прыватную ўласнасць грамадзянамі, у Мінску ў 2006 годзе складала Br44,75 млн за гектар. Кадастравы ж кошт зямельных участкаў, якія можна перадаваць у прыватную ўласнасць грамадзян у беларускай сталіцы, складае ў сярэднім Br504,869 млн за гектар і вагаецца ад Br228,551 млн да Br1,484 млрд за гектар. Гэта значыць рэальны кошт зямлі значна вышэйшы, і гэта справядліва.

У сельскіх населеных пунктах нарматыўныя цэны на зямельныя ўчасткі ў залежнасці ад тыпу глеб і віду зямель вар'іраваліся ад Br259,3 тыс. за гектар да Br10,218 млн. Іх кадастравы кошт вагаецца ад Br214,2 тыс. за гектар да Br840 млн. У сельскіх населеных пунктах, размешчаных недалёка ад абласных цэнтраў і Мінска, кошт зямель дасягае максімальных значэнняў для сельскіх населеных пунктаў, садоўніцкіх таварыстваў і дачных пасёлкаў. Напрыклад, у Мінскім раёне ў вёсцы Бараўляны з развітой інфраструктурай адна сотка зямлі будзе каштаваць $710—2500, а ў пасёлку Юзуфова, дзе ўмовы пражывання менш камфартабельныя, у некалькі разоў танней — $130—390.

Кадастравая ацэнка кошту зямлі будзе абавязковая толькі для тых, каму зямельныя ўчасткі перадаюцца з моманту ўступлення ў сілу новага ўказа.

Зямельныя ўчасткі, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці, перадаюцца ў прыватную ўласнасць па заяве грамадзяніна Рэспублікі Беларусь рашэннем адпаведнага выканаўчага камітэта пасля ўнясення платы за зямельны ўчастак. Даведацца пра кадастравы кошт свайго зямельнага ўчастка можна ў мясцовым выканаўчым камітэце па месцы знаходжання зямельнага ўчастка або на сайце ДУП «Нацыянальнае кадастравае агенцтва».

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

РОЗГАЛАС — АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### У ГЭТЫЯ ВЫХАДНЫЯ ДА 31 ГРАДУСА ЦЯПЛА

**19 мая пройдуць кароткачасовыя дажджы, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга Фядотава. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Удзень паветра прагрэецца да плюс 17—23 градусаў. На паўднёвым усходзе краіны — да 24—29 градусаў.**

У нядзелю, 20 мая, будзе пераважна без ападкаў. Толькі ўдзень на паўднёвым усходзе не выключаны лакальныя кароткачасовыя дажджы. У начны час тэмпература паветра будзе вагацца ад 7 градусаў цяпла на поўначы да 18 градусаў вышэй за нуль на поўдні. Удзень — да 22—27 градусаў, у паўднёва-ўсходніх раёнах слупок тэрмометра ўзнімецца да 28—31 градуса цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня характар надвор'я істотна не зменіцца. Будзе пераважаць цёплае надвор'е. Аднак 23 мая пройдуць навальнічныя дажджы і стане крыху халадней. Дзённая тэмпература ў сярэднім па рэспубліцы складзе 20—26 градусаў цяпла, а на паўднёвым усходзе па-ранейшаму будзе горача.

### КАЗУЛЯ ГУЛЯЛА ПА ПАРКУ

**Ці то яна, як жартуюць гамяльчане, ішла на танцпляцоўку ў цэнтральны парк імя Луначарскага, ці проста хацела прайсці па набярэжнай Сожа, толькі факт застаецца фактам: казуля пераадолела сама меней дзесяць кіламетраў па вуліцах горада. Што яе прывабіла сюды, застаецца таямніцай.**

Магчыма, мы б так і не даведаліся аб начным візіце лясной прыгажуні, калі б яна не трапіла ў бяду. А менавіта: відаць, спужаўшыся кагосьці, казуля спрабавала пераскочыць з разгону чыгунную агароджу, ды і «засела» ў адным з яе праёмаў. Выкараскацца з гэтай пасткі самой ёй так і не ўдалося. Яе ўбачылі людзі раніцай і паведамілі аб здарэнні ў аддзел МНС. З пашкоджанымі нагамі казуля была перададзена экалагічнай службе і лесагаспадарчаму аб'яднанню, якія ўзялі над ёй шэфства.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

### СПРАВА НА 800 МІЛЬЁНАЎ

**У адносінах да вядучага эканаміста Мазырскага аддзялення ААТ «Белінвестбанк» узбуджана крымінальная справа.**

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-службе Камітэта Дзяржкантролю, крымінальная справа па прыкметах злачынства, прадугледжанага часткай 6 артыкула 16 КК — «саўдзельніцтва ў злачынстве» і часткай 1 артыкула 237 КК — «выманьванне крэдыту або датацый», у адносінах да адказнай асобы ўзбуджана супрацоўнікамі Мазырскага міжрайаддзела ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Гомельскай вобласці. Як мяркуецца, падазроны ў верасні 2004 года аказаў садзейнічанне ў выманьванні крэдытных рэсурсаў у суме 800,6 мільна рублёў адказным асобам аднаго са сталічных унітарных прадпрыемстваў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### ПІСТАЛЕТ І ПАТРОНЫ СПРАБАВАЛІ ПРАДАЦЬ КАЛЯ ГРОДЗЕНСКАГА МАГАЗІНА

**Паводле інфармацыі прэс-групы УКДБ па Гродзенскай вобласці, супрацоўнікі дзяржбяспекі затрымалі 48-гадовага жыхара абласнога цэнтра непадалёк ад магазіна «Лімож».**

Гэты беспрацоўны меў намер палепшыць сваё матэрыяльнае становішча на 1600 долараў за кошт продажу сучаснага шаснаццацізараднага пісталета нямецкай вытворчасці «WALHTER P99» і 20 баявых патронаў «Парабэлум» калібра 9 мм. Яшчэ адзін пісталет быў выяўлены пры вобыску па месцы яго жыхарства.

Зброя накіравана ў экспертна-крыміналістычны цэнтр УУС Гродзенскага аблвыканкама для праверкі яе магчымага выкарыстання пры ўчыненні злачынстваў на тэрыторыі вобласці і рэспублікі, узбуджана крымінальная справа. Сёлета, дарэчы, супрацоўнікамі УКДБ спынены незаконны абарот 8 адзінак агнястрэльнай зброі і больш чым 2 тысяч боепрыпасаў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

### ЛОСЬ... ВІНАВАТЫ Ў ДТЗ

**Аўтамабіль сутыкнуўся з ласём. У выніку ДТЗ вадзіцель і пасажырка аўто атрымалі цяжкія траўмы. Гэта адбылося ў 22.00 у Талачынскім раёне на аўтадарозе мяжа Расійскай Федэрацыі—Мінск—Брэст, недалёка ад вёскі Рыжычы.**

За рулём аўтамабіля «Опель-Амега» знаходзіўся індывідуальны прадпрымальнік з Мінска, а ў пасажырскім салоне была яго жонка. Пацярпелыя шпіталізаваны. Лось, які нечакана выбег на трасу, у выніку аварыі таксама быў траўмаваны.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ВЯСЛЯРНЫ КАНАЛ: для спартсменаў, аматараў і жыхароў

**У мікрараёне Брэста «Кавалёва» недалёка ад пагранперахода «Варшаўскі мост» літаральна за паўтара года зарослая хмызняком набярэжная Мухаўца ператварылася ў прыгожы суперсучасны спартыўны аб'ект. Па прывычцы ўсе называюць новую ўстанову вяслярным каналам, але афіцыйная яе назва — Цэнтр алімпійскага рэзерву па веславанню.**



Фота Святланы КРАЎЧУК.

Дырэктар цэнтра Фёдар Калінкевіч паказвае сваю гаспадарку: агульная плошча комплексу — 39 гектараў. Памеры вяслярнага канала — 2250 метраў у даўжыню і 158 у шырыню, складаецца ён з шасці дарожак. Да таго канала, які быў, прыбавілася два дапаможныя. На лініі дарожак — флагштокі, электроннае табло, судзейскія вышкі, падобныя на ветразі. У асноўным будынку комплексу размешчаны інтэрнат-гасцініца на сто месцаў, спартыўна-аздараўленчы комплекс, два вяслярныя басейны, медыцынскі цэнтр, адміністрацыя і адкрытая трыбуна з крэсламі для гледачоў.

І ўжо ў апошнія дні мая Брэст прыме ўдзельнікаў міжнародных стартаў «Дружба». Памерацца сіламі на спаборніцтвах юнакоў да 18 гадоў пажадалі прадстаўнікі 11 краін свету. А налета запланаваны юнацкія Еўразійскія гульні. Наша краіна зрабіла заяўку на правядзенне ў 2010 годзе чэмпіянату свету па веславанню. Літаральна днямі Міжнародная федэрацыя гэтага віду спорту будзе разглядаць пытанне ў Аўстрыі, куды запрошаны мэр Брэста.

Хоць Брэсцкаму абласному цэнтру алімпійскага рэзерву ўсяго год, наш вяслярны канал мае немалую гісторыю. Менавіта ў водах Мухаўца трэніраваўся першы алімпійскі чэмпіён у веславанні на байдарках Сяргей Макаранка. А праз 60 гадоў алімпійскую капілку папоўнілі навучэнкі цэнтра Наталля Гелах і Юлія Бічык. Паспяхова выступіла Марыя Варона. Падаюць неблагія надзеі на будучую Алімпіяду двойка спартсменаў у складзе Аляксандра Казубоўскага і Андрэя Татарчука. І з тых 400 хлопчыкаў і дзяўчынак, з якімі займаюцца трэнеры, можна не сумнявацца, некаторыя вырастуць у сапраўдных майстроў спорту.

Нацыянальным зборным камандам для падрыхтоўкі да Алімпіяды і этапаў Кубка свету тут ёсць усе ўмовы: элітны інтэрнат для пражывання, кафэ для харчавання, элінгі з сістэмай ацяплення для захавання лодак. А пачыналася ўсё са слова. Пасля перамогі на Алімпіядзе-2004 Кацярына Карстэн вымавіла перад камерамі з вялікім жалем прыкладна так: «У Брэсце ёсць вяслярны канал. Але няма ніякай базы, і ўжо, відаць, ніколі не будзе». Вось гэтая роспач спартсменкі закранула гонар людзей, ад якіх многае залежыць. Кіраўнік дзяржавы неўзабаве наведаў аб'ект і даў даручэнне будаўнікам зрабіць інфраструктуру лепшай у Еўропе.

Так яно і выйшла. Тая ж Кацярына Карстэн, якая месяц таму была тут, сказала, што канал у Брэсце цяпер сусветнага ўзроўню. Узвялі аб'ект рабочыя і інжынеры ААТ «Будтрэст № 8» па аўтарскаму індывідуальнаму праекту групы архітэктараў ААТ «Брэстпраект» пад кіраўніцтвам Валерыя Кяскевіча. Паводле слоў аўтара, эстэтыку галоўнага корпуса цэнтра вырашана было пабудаваць на дрэве. Таму так арыгінальна выглядаюць столі ў памяшканнях.

Горад атрымаў не толькі прэстыжны спартыўны комплекс, але і цэлы шэраг, так бы мовіць, практычных выгод. Адной гасцініцай, напрыклад, стала больш. А нумары-люкс, паводле ацэнак спецыялістаў, у Цэнтры нават лепшыя, чым у нашай знакамітай «Весце». Нядаўна горад над Бугам наведала афіцыйная кітайская дэлегацыя. Гасцей размясцілі ў новым гатэлі.

Канферэнц-зала на 200 месцаў можа стаць утульным камерным месцам для правядзення самых разнастайных мерапрыемстваў. Старшыня музычнага таварыства Брэста даўно і настойліва крытыкуе гарадскія ўлады за тое, што тэатр драмы і музыкі пераўтварылі ў клуб. Розныя юбілеі прадпрыемстваў, арганізацый традыцыйна праводзяцца ў тэатры. І вось — альтэрнатыва: сучасная зала са стыльнай мэбляй, арыгінальным асвятленнем — гатова прыняць удзельнікаў святаў і бізнэс-форумаў.

Пра карысць новага аб'екта для мікрараёна, шматпавярхоўкі якога стаяць адразу праз дарогу, гаворка асобная. Па-першае, самой дарогі тут і не было. І калі яна з'явілася б, вялікае пытанне. А зараз пракладзены асфальт і пешаходныя дарожкі. Вакол высаджаны дрэвы. А зусім нядаўна тут усё нагадвала закінутую пустэчу. Нават невялікі вецярок быў здольны выклікаць пясчаную буру, калі ў паветра падымаліся хмары дробнага пяску. Уздоўж ракі паступова вымалёўваецца зона адпачынку з пляжам, лыжаролернай трасай, выратавальнай станцыяй з гандлёвымі павільёнамі.

У вялікім спальным мікрараёне няма ніводнага культурнага аб'екта, а дагэтуль не было і спартыўнага. Хутка для ўсіх, хто жадае ўмацаваць здароўе, адчыняцца тры трэнажорныя залы, можна будзе набыць абанемент у басейн, саўну, адкрыюцца групы фітнэсу, гідрааэробікі.

І яшчэ. Што мяне прыемна ўразіла на ўваходзе, гэта аб'ява: «На тэрыторыі комплексу курыць забаронена». Пра гэту заяўку на прыкмету высокай ступені цывілізаванасці я сказала ў самым пачатку нашай размовы з дырэктарам Фёдарам Калінкевічам. Фёдар Сяргеевіч перакананы, што цэнтр алімпійскага рэзерву па веславанню стаў вялікім штуршком для паляпшэння культуры асабліва маладога пакалення мікрараёна. «Дзеці, што проста катаюцца тут на ролікавых каньках, — кажа мой суразмоўца, — шукаюць урну, каб выкінуць нейкі фанцік. Вы ж бачыце, як чыста і прыгожа навокал, і гэта само па сабе выхоўвае. Раней у хмызняках над рэчкай знаходзілі сумнеўныя пакеты з клеем, невядомага паходжання шпрыцы. Там, дзе бадзялася нічым не занятая моладзь, зараз гуляюць па выхадных і вечарамі ўздоўж набярэжнай сем'і, закаханыя пары».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

ISSN 1990-763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.05.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 145,00 |
| 1 еўра | 2 897,90 |
| 1 латвійскі лат | 4 163,43 |
| 1 літоўскі літ | 839,28 |
| 1 чэшская крона | 102,90 |
| 1 польскі злоты | 764,32 |
| 1 расійскі рубель | 82,98 |
| 1 украінская грыўня | 427,72 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 25,8492 |
| 10 UAH | 51,3003 |
| 1000 BYR | 12,0166 |
| EUR | 34,8706 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 18.05.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2140 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

**Звязда -90: адваротны адлік**

## Газета заслугоўвае пашырэння аб'ёму



**За 82 дні да юбілею «Звязды» калектыў рэдакцыі віншуе Рыгор Чуйко, генеральны дырэктар аграфірмы «Ждановічы», даўні сябра нашай газеты і яе пастаянны чытач:**

— Я знаёмы са «Звяздой» яшчэ са школы, таму з 90 гадоў яе існавання чытаю газету ўжо гадоў 30. «Звязда» падкупляе тым, што яна на роднай матчынай мове. Сярод аўтараў выдання мне асабліва падабаецца, як піша Валянціна Доўнар. Яна нават выпусціла кніжку сваіх нарысаў. На юбілей «Звязды» хачу пажадаць газеце пашырэння аб'ёму, каб больш месца адводзілася на цікавыя матэрыялы, асабліва па сельскагаспадарчай тэматыцы, каб асвятляліся усе накірункі і задачы, якія былі агучаны на Усебеларускім сходзе. У газеце прадстаўлены ўсе тэмы, але хацелася б, каб на іх выдзялялася не 4 старонкі, а хоць бы па 6.

**Ірына ПРЫМАК.**

# ЗЯМЛЯ НАБЫВАЕ РЭАЛЬНЫ КОШТ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**— Як цяпер будуць рэгулявацца зямельныя адносіны пры продажы дачнага ўчастка або перадачы дома, які знаходзіцца на гэтым зямельным участку ў спадчыну і ў іншых сітуацыях?**

— Аб правах уласнікаў дачных участкаў трэба сапраўды гаварыць асобна, паколькі іх найбольш пытанняў. Нагадаю, у 2003—2005 гадах у рэспубліцы праведзена кадастравая ацэнка земель населеных пунктаў, садоўніцкіх таварыстваў і дачнага будаўніцтва. Вынікі кадастравай ацэнкі земель (згодна з пастановай Савета Міністраў ад 17 снежня 2002 года № 1764) разгледжаны і зацверджаны рашэннямі мясцовых выканаўчых камітэтаў.

Аднак, паводле даных выканкамаў, з 1 верасня 1993 года па 31 снежня 2006 года грамадзянамі Беларусі па льготнай і нарматыўнай цане было выкуплена 72,1 тыс. га земель, размешчаных у населеных пунктах, садоўніцкіх таварыствах і дачных пасёлках. Указ № 213 на гэтых грамадзян не распаўсюджваецца, паколькі яны ўжо з'яўляюцца ўласнікамі земель з моманту іх выкупу ў дзяржавы. Таму яны могуць прадаваць іх або адчужаць па дагаворнай цане.

Аднак хачу звярнуць увагу на тое, што садовыя домікі, дачы і жылыя дамы, размешчаныя на зямельных участках, якія знаходзяцца ў прыватнай уласнасці, адчужаюцца толькі разам з гэтымі будынкамі. Падкрэсліваю, што пры адчужэнні садовых домікаў, дач і жылых дамоў, размешчаных на зямельных участках, якія знаходзяцца ў пажыццёвым спадчынным уладанні, не патрэбна вызначэнне кадастравага кошту гэтых зямельных участкаў.

**Таццяна ЛОБАС, БЕЛТА.**

З першых вуснаў

# АЭС будзе пабудавана ў Чавускім раёне

**Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Барыс Батура на прэс-канферэнцыі паведаміў журналістам, што прынята прынцыповае рашэнне аб пабудове АЭС у Чавускім раёне, паблізу вёскі Красная Паляна. Гэта за 40 кіламетраў ад Магілёва.**

— Ну і што ў гэтым дрэннага? — рытарычна перапытаў кіраўнік аблвыканкама. — Я лічу, што гэта вялікі імпульс для развіцця эканомікі рэгіёна. А побач з намі ўжо ёсць Смаленская АЭС. Дык лепей ужо самім весці эксплуатацыю — уласнымі надзейнымі рукамі. Будаўніцтва АЭС — гэта доўгая працэдура. Магу толькі сказаць, што першы блок беларускай атамнай станцыі з'явіцца гадоў праз 8—10.

На прэс-канферэнцыі былі закрынуты розныя аспекты жыцця рэгіёна. Магілёўская вобласць, паабяцаў Барыс Батура, будзе рабіць усё магчымае, каб захаваць сваю пазіцыю на рэспубліканскай Дошцы гонару. Вынікі работы народнай гаспадаркі за 4 месяцы паказваюць, што гэта цалкам магчыма: напрыклад, за гэты час знізілася колькасць стратных прадпрыемстваў.

У праграме развіцця малых гарадоў у Магілёўскай вобласці плануецца рэалізаваць больш за дзве сотні інвестыцыйных праектаў. Будзе створана прыкладна 20 тысяч новых працоўных месцаў.

— Галоўная задача мясцовых уладаў — прыцягваць інвестыцыі і развіваць прадпрымальніцтва, — лічыць Барыс Батура. — І акрамя вытворчасці, націск трэба зрабіць на сферу абслугоўвання, якая ў нас яшчэ недастаткова развітая.

Кіраўнік Магілёўскай вобласці выказаў сваё меркаванне наконт праблемы льгот, якая цяпер актыўна абмяркоўваецца ў краіне.

— Ільготамі ў Беларусі карыстаецца 60 працэнтаў насельніцтва, — зазначыў ён. — Але, вобразна кажучы, гэта ж не «дом адпачынку». Ільгота павінна быць адраснай і дадзена менавіта таму, хто мае ў ёй патрэбу. Перагляд сістэмы льгот даўно наспеў, размовы вяліся пра гэта яшчэ гадоў 5—6 таму. Тым больш, што адбылося павелічэнне даходаў — заробкаў і пенсій. Вызваленыя сродкі будуць выдаткаваны на дзяцей, і мне падаецца, што з гэтым не варта спрачацца, а трэба кожнаму зразумець.

Размова таксама была і пра дэмаграфічную сітуацыю. Найбольш уплываюць на працягласць жыцця людзей харчаванне, вада і здаровы лад жыцця. Па ўсіх гэтых напрамках, запэўніў Барыс Батура, у вобласці вядзецца работа. Па першых двух — у межах праграм па адраджэнню вёскі (маецца на ўвазе вытворчасць і перапрацоўка сельскагаспадарчай прадукцыі) і «Чыстая вада».

— А здаровы лад жыцця — гэта ў нашых сілах, — сказаў старшыня Магілёўскага аблвыканкама. — І цяперашняя інтэнсіўная прапаганда ў СМІ дае плён.

Што ж датычыцца хваравітай тэмы — алкагалізацыі грамадства, то Барыс Батура шчыра выказаў сваё меркаванне: тут можа дапамагчы «сухі» закон — жорсткае абмежаванне альбо забарона ўжывання алкагольных напояў, як гэта калісьці было ў Амерыцы і Фінляндыі.

— Гэта страшна, як людзі паводзяць сябе, прыцягваюць да алкаголю моладзь, а часам ад гэтага гінуць дзеці, — сказаў кіраўнік вобласці. — Гэта страшны біч! Мне, канешне, тлумачаць, што забароннымі мерамі нельга вырашыць праблему алкагалізацыі. Але грамадству трэба прыкласці сур'ёзныя намаганні, каб перамагчы гэтае зло. Тут, канешне, яшчэ і праблемы культуры людзей: выпіць можна і нават часам трэба, але неабходна ведаць меру.

**Ілона ІВАНОВА.**

**ОАО «Минский приборостроительный завод» сообщает:**

**28 мая 2007 года в 14.00**
**в актовом зале общества по адресу:**
**г. Минск, пр. Независимости, 58,**
**состоится очередное собрание акционеров и их представителей.**

**Повестка дня:**

1. Выделение из состава ОАО «Минский приборостроительный завод» УП «Клецкий механический завод» и государственная регистрация на его базе предприятия как имущественного комплекса.
2. Принятие новой редакции Устава ОАО «Минский приборостроительный завод».

**Регистрация участников собрания** — с 13 до 14 часов по предъявлении паспорта.

Акционер ОАО «Минский приборостроительный завод» принимает участие в работе собрания лично или через своих представителей, действующих на основании доверенности.

**Наблюдательный совет.**

## Здымак з канверта

*Вельмі цікавы здымак: прыгожая маладая жанчына побач з Уладзіславай Францаўнай Луцэвіч, жонкай Янкі Купалы... А вось ліст, напісаны вельмі неразборліва. Добра, што аўтарка запісала свой нумар тэлефона. Тэлефаную ў Оршу. Аляксандра Іванаўна Дзедзінец яшчэ раз просіць прабачэння за кепскі почырк... Гутарылі мы даволі доўга. Аляксандра Іванаўна — чытачка «Звязды» з амаль паўвекавым стажам, дый сама друкавалася на старонках газеты. «Пісала ўспаміны пра Кандрата Крапіву, калісьці сустракалася з ім...».*

*— А з якога вы года? — удакладняю.*

*— З 1914-га... На выдатна закончыла Мінскі медыцынскі інстытут — яшчэ да вайны, у 1937 годзе.*

*У Аляксандры Іванаўны дзве дачкі, старэйшая таксама ўрач. Малодшая закончыла інстытут замежных моў, выкладае ў медвучылішчы. Тры ўнукі, чатыры праўнукі...*

*— ...А почырк такі кепскі — бо вельмі пагоршыўся зрок. Газеты чытаю з лупаю... Але гэта не перашкаджае Аляксандры Дзедзінец кіраваць народным клубам ветэранаў вайны і працы «Яшчэ не вечар», які нядаўна адзначыў 10-годдзе. Каля ста ўдзельнікаў!.. «26 мая паедзем у Віцебск на конкурс, вельмі хвалюемся», — прызнаецца Аляксандра Іванаўна.*

*Шчыра жадаем поспехаў! Нізка кланяемся за вернасць «Звяздзе», за прыгожае жыццё, за душэўную маладосць! Думаю, усе з цікавасцю прачытаюць гэты допіс.*

**Таццяна ПАДАЛЯК.**

# ЛЯЎКОЎСКІЯ СУСТРЭЧЫ

## *«Нас з цёткай Уладзяй зазняў мясцовы фотааматар...»*

Мінула больш як паўстагоддзя, але і зараз помняцца Ляўкоўскія сустрэчы. Мне пашанцавала: нейкі фотааматар зазняў мяне побач з цёткай Уладзяй.

А было так. Ішоў 1947 год. Уладзіслава Францаўна з групай паэтаў завітала ў Ляўкі. У той час музея Янкі Купалы ў Ляўках не было. Спыніліся ў Копыскім лясніцтве. Галоўным ляснічым быў шаноўны лесавод Яфім Смажэўскі, з якім яшчэ да вайны сябравалі Янка Купала і яго Уладка. На сустрэчу са слыннымі гасцямі завіталі вучні суседніх школ, настаўнікі і калгаснікі з калгаса імя Янкі Купалы.

Сустрэча была шматлюднай, на свежым паветры пад развесістымі зялёнымі дрэвамі. Ліліся вершы Я. Купалы з вуснаў вучняў, паэтаў, успаміны пра песняра, якога ў той час добра памяталі: яго любілі і паважалі ўсе, каму пашанцавала з ім сустракацца.

Потым у кватэры ляснічага было невялікае застолле. Крыху выпілі. Памянулі славутага песняра. Прыпамінаю — Уладзіслава Францаўна прасіла паэтаў: «Хлопцы, чытайце вершы Янкі, я ж вас для гэтага і везла ў Ляўкі».

Мне пашанцавала сядзець побач з шаноўнай госцяй. Пазнаёміліся бліжэй, раптам яна кажа: «Давайце сходзім к Дняпру». Я зразумела, што яна хоча пахадзіць па тых мясцінах, дзе хадзіла разам са сваім Янкам. Так і было. Расказвала: вось тут ён чытаў вершы, як цяпер называюць, з «Ляўкоўскага цыкла»... І працягвала: «Любіў мой Янка гэтыя мясціны, любіў глядзець на дняпроўскія хвалі, якія злучаюць Расію, Беларусь і Украіну. Любіў ранкам слухаць птушыны шчэбет...».

Раптам сціхла. Задумалася і нібы сама сабе кажа: «Не тыя берагі, не той Дняпёр».

І зноў змоўкла... Мы сядзелі на нейкім карчы на беразе Дняпра. Сядзелі і маўчалі: кожная з нас са сваімі думкамі. Тады яшчэ вельмі балюча было ад страты сваіх дарагіх і любімых. Уладзя страціла Янку, а я — Аляксандра, бацьку маёй дачушкі Ларысы, якога яна ведае толькі па фотаздымках.

Уладзіслава Францаўна ўмела не толькі добра расказваць, але і добра, уважліва слухаць. Яна папрасіла: «Алеся, раскажы крыху пра сябе». А мне было што расказаць. Мая суразмоўца вельмі расчулілася і была да мяне яшчэ больш спагадлівай...

**Аляксандра ДЗЕДЗІНЕЦ.**
*г. Орша.*



*Уладзіслава ЛУЦЭВІЧ і Аляксандра ДЗЕДЗІНЕЦ, 1947 год.*

## ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ ЗАМЕСТ ЛЕКАЎ

### Сёння — дзень работнікаў фізічнай культуры і спорту

Калі легкаатлетка Юлія Несцярэнка заваявала залаты алімпійскі медаль у Афінах, а фрыстайліст Дзмітрый Дашчынскі стаў сярэбраным прызёрам Белых гульняў у Турыне, мы радаваліся поспехам нашых спартсменаў, аднак мала хто задумваўся, што вынікі на міжнароднай арэне — гэта не толькі заслуга саміх атлетаў, але і іх трэнераў, урачоў, масажыстаў і іншых спецыялістаў. Без іх дапамогі нават самы таленавіты атлет не раскрые свой патэнцыял. Сёння ў работнікаў фізічнай культуры і спорту — прафесійнае свята. Яго адзначаюць усе, хто задзейнічаны ў спартыўнай сферы без выключэння, пачынаючы ад настаўнікаў фізічнай культуры ў школах, якія могуць раскрыць будучую спартыўную «зорку», і заканчваючы тымі спецыялістамі, якія ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы нашых атлетаў да Алімпіяд.

Паводле інфармацыі Уладзіміра Аляшкевіча, першага намесніка міністра спорту і турызму Беларусі, у спартыўнай галіне краіны зараз налічваецца больш як 26 тысяч спецыялістаў, прычым 21,7 тысячы з іх маюць вышэйшую і сярэднюю фізкультурную адукацыю. У рэспубліцы культывуюцца 132 віды спорту, з іх 48 алімпійскіх. Для заняткаў фізічнай культурай і спортам дзейнічаюць каля 22 тысяч спартыўных пабудоў (241 стадыён, 239 басейнаў, 42 манежы і г. д.). Зараз ідзе будаўніцтва самага глабальнага спартыўнага аб'екта краіны — «Мінск-арэны», якая прадугледжана для прадстаўнікоў 28 відаў спорту і разлічана на 15 тысяч гледачоў. У бліжэйшыя гады з'явяцца лядовыя палацы ў Барысаве, Баранавічах, Лідзе, Бабруйску і г. д. Фінансаванне сферы фізічнай культуры і спорту ў нашай краіне павялічылася ў параўнанні з 2002 годам у 3,6 раза. Нездарма. Прадстаўнікі еўрапейскіх навуковых інстытутаў падлічылі, што на 1 еўра, укладзены ў спорт, эканоміцца каля 12 еўра медыцынскіх затрат. Згодна са статыстыкай, 1 мільён 500 тысяч жыхароў нашай краіны займаюцца фізічнай культурай і сваім аздараўленнем.

**Ірына ПРЫМАК.**

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## РАСІЯ ТРЫВОЖЫЦЬ ЕС

**У Самары прайшоў саміт Расія—ЕС, на якім Захад спрабаваў у чарговы раз знайсці агульную мову з Усходам. Еўрасаюз на ім прадстаўлялі канцлер Германіі Ангела Меркель і кіраўнік Еўракамісіі Жазэ Мануэл Барозу, іх сустракалі прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін і прэм'ер-міністр Міхаіл Фрадкоў.**

Нягледзячы на заявы бакоў аб добрых узаемаадносінах, на справе адбываецца ўсё наадварот. Еўрапейскія чыноўнікі канкрэтна адзначылі Уладзіміру Пуціну, што праблемы адносінаў паміж Эстоніяй, Польшчай і расійскай апазіцыяй сур'ёзна трывожаць Брусель. Праблема з польскім мясам і гароднінай, пастаўка якіх спынілася яшчэ ў 2005 годзе, дагэтуль не вырашана, з гэтым згадзіўся і прэзідэнт Расіі.

Аднак ён адзначыў, што польскі бок нават не збіраецца размаўляць з Расіяй і толькі дзякуючы Ангеле Меркель ёсць магчымасць абмяркоўваць гэтае пытанне. Наконт апазіцыі Пуцін сказаў, што яна яму не перашкаджае, а што датычыцца разгону мітынгаў, дык рашэнні аб гэтым прымаюць мясцовыя ўлады. Дарэчы і ў Еўропе, падкрэсліў прэзідэнт Расіі, з непажаданымі выступленнямі таксама змагаюцца рознымі сродкамі, а ў Таліне ў час выступленняў наогул загінуў адзін расіянін. Аднак зносіны з прэсай палітыкі заканчвалі на пазітыўнай ноце, і Пуцін папрасіў не нагнятаць атмасферу, бо Расія і ЕС усё роўна будуць супрацоўнічаць.

## УРАД НАПАЛОВУ ЛЯ ФАМ

**Новы прэм'ер-міністр Францыі Франсуа Фіён аб'явіў склад новага ўрада. Палову пастоў у ім занялі жанчыны, а міністрам замежных спраў стаў Бернар Кушнер.**

Многія з назначаных членаў кабінета працавалі яшчэ з Жакам Шыракам, папярэднікам Ніколя Саркозі. Але ёсць і новыя назначэнні, уключаючы першага ў Францыі міністра, які паходзіць з Паўночнай Афрыкі. Гэта міністр юстыцыі Рашыда Даці. Другім па важнасці чалавекам у кабінеце міністраў названы Ален Жупе, які ўзначальваў урад краіны ў сярэдзіне 90-х. Назначэнне ж сацыяліста Кушнера, які на працягу выбарчай кампаніі падтрымліваў саперніцу Саркозі Сегален Руаяль, стварыла раскол у левых колах краіны.

## НАЛЁТЫ НА МІЛЬЁНЫ

**Увечары ў чацвер у цэнтры Масквы адбыўся напад на аўтамашыну, у выніку якога было выкрадзена больш за $1 млн.**

Злачынцы на аўтамабілі Audi-A6 заблакіравалі рух аўтамашыне BMW X5, у якой знаходзіліся супрацоўнікі адной з камерцыйных фірмаў з буйной сумай грошай. Рабаўнікі адкрылі агонь з агнястрэльнай зброі, пасля чаго забралі грошы і зніклі. У машыне ніхто не пацярпеў. Па даных праваахоўных органаў, бандыты знеслі $1,2 млн. План «Перахоп» ніякіх вынікаў не прынёс.

Гэта ўжо другі буйны налёт у Расіі за тыдзень. 12 мая ў Чыце злачынцы абрабавалі аддзяленне Ашчаднага банка Расіі і скралі са сховішча больш за 38 млн рублёў, 250 грамаў золата і 1750 грамаў серабра ў злітках. Пры нападзе былі застрэленыя абодва ахоўнікі, якія дзяжурылі ў той час. Як пазней высветлілася, адзін з іх аказаўся саўдзельнікам, менавіта ён упусціў рабаўнікоў у банк праз акно. Пры праверцы на дэтэктары хлусні падазрэнні выклікала адна з супрацоўніц, якая была затрымана. У выніку пошукавых мерапрыемстваў былі затрыманы чатыры ўдзельнікі банды, у тайніку ў лесе былі знойдзены грошы, але толькі ў колькасці 18,4 млн рублёў.

Як стала вядома ўчора, забойцам абодвух ахоўнікаў і арганізатарам налёту на банк аказаўся былы капітан Упраўлення барацьбы з арганізаванай злачыннасцю Чыцінскай вобласці. Па неафіцыйнай версіі, ахоўнік банка пакінуў дома жонцы спіс саўдзельнікаў і запіску з просьбай аднесці гэты спіс у міліцыю, калі з ім што-небудзь здарыцца. Былы капітан УБАЗ прызнаўся ва ўсім, а таксама паказаў месца забойства свайго саўдзельніка. Між тым следчым пакуль невядома, дзе знаходзяцца астатнія грошы і каштоўныя металы.

Глядзі, што п'еш

## ДВОЕ МІНЧАН АТРУЦІЛІСЯ СУРАГАТАМ АЛКАГОЛЮ

**У сталіцы ў адной з кватэр раніцай былі знойдзены целы двух мужчын без прыкмет гвалтоўнай смерці.**

Паводле папярэдняй інфармацыі, 48-гадовы гаспадар і яго 41-гадовы госць сталі ахвярамі сурагатнага алкаголю: непрацуючыя мінчане, як мяркуецца, атруціліся няякасным напоем.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## А ПАДУМАЎ, ШТО ГЭТА ПІВА

**У бальніцу Новалукомля з атручэннем дастаўлены мясцовы беспрацоўны жыхар.**

Як растлумачыў дзяжурным медыкам, выпіў нешта з бутэлькі, думаў, што гэта піва. А на самай справе высветлілася, што нехта са сваіх у гэтай бутэльцы захоўваў настой чэмеру, што выкарыстоўваюць для лячэння хвароб людзей і жывёл.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Віншуем з юбілеем
былога супрацоўніка
«Звязды»
**Аляксандра Міхайлавіча**
**ДЗЕРАВЯНКУ.**

*Такі ж, якім быў ты заўжды —*
*Пісьменнік, сапраўдны маёр.*
*Імпэт твой з гадамі не знік —*
*Рамантык, удалы грыбнік.*
*З табою, Алесь, хоць куды —*
*У разведку, на піва, у грыбы...*

**Сябры.**

**ОО «ПРОМСПЕЦАВТОМАТИКА» (ПРОДАВЕЦ) СОВМЕСТНО С УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»**

проводят открытый аукцион по продаже незаконсервированного не завершенного строительством корпуса покрытий в г. Минске по ул. Стебенева, 12, общей площадью 2916 кв.м (согласно проектно-сметной документации). Земельный участок площадью 0,1394 га под постройками и дворами для обслуживания объекта, в том числе 0,0415 га с ограничениями в использовании земель (охранные зоны линий электропередач, трубопроводов и иных инженерных сооружений) предоставлен во временное пользование сроком по 31.03.2009 г. Начальная цена составляет 897 099 868 рублей без учета НДС. Объект продается без условий. Возможна рассрочка платежа. Договор купли-продажи заключается в течение 10 дней после проведения аукциона. Задаток в размере 40 000 000 рублей и плата за участие в аукционе в размере 4 базовых величин перечисляются на расчетный счет № 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости». Закрепление земельного участка за новым собственником будет произведено Минской городской землеустроительной и геодезической службой. Аукцион состоится 31 мая 2007 г. в 10.30 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 30 мая 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок: 227-40-22.**
**Интернет: www.mgcn.by**

**Санаторно-курортное унитарное предприятие «Белагроздравница» БелАПС (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости»**

проводят открытый аукцион по продаже комплекса зданий, сооружений и оборудования филиала «Детский санаторий «Дружба» в районе поселка Городище Минского района (далее-объект). Продаже подлежат: административное здание (84,9 кв.м), лечебный корпус (304,9 кв.м), спальный корпус № 1 (207,9 кв.м), спальный корпус № 2 (409,0 кв.м), спальный корпус № 3 (214,1 кв.м), спальный корпус № 4 (143,0 кв.м), столовая (1956,2 кв.м), веранда 61,9, водолечебница (75,5 кв.м), склад (25,1 кв.м), котельная (500,9 кв.м), ангар (559,1 кв.м), гараж (312,2 кв.м), пристройка к гаражу (82,9 кв.м), артезианские скважины питьевой и минеральной воды, ограждения, емкости. Площадь земельного участка 10,73 га. Начальная цена 2 200 700 000 рублей включая НДС.

Размер задатка составляет 5% от начальной цены лота и перечисляется на расчетный счет № 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, код 153001331 г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, УНП 190398583, УП «Минский городской центр недвижимости». Порядок проведения торгов оговорен в условиях проведения аукциона. Договор купли-продажи заключается в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона. Закрепление земельного участка за новым собственником будет произведено местной землеустроительной и геодезической службой. Покупатель объекта обязан выполнить следующие условия:

— переоформить акт землепользования;
— соорудить забор по границе земельного участка между покупателем и общежитием филиала «Детский санаторий «Дружба»;
— обеспечить жильцов общежития филиала «Детский санаторий «Дружба» жизненно необходимыми условиями проживания (отоплением, электроэнергией, водоснабжением и канализацией) на условиях договора между покупателем и УП «Белагроздравница» БелАПС.

Оплата за объект производится в соответствии с договором купли-продажи. Аукцион состоится 5 июня 2007 г. в 15.00. по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 4 июня 2007 г. до 16.00. по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39.

**Контактный телефон: (8-017) 227- 40- 22.**

Добры дзень, родныя словы!

# «ЯК СПРАВЫ?» — «ЯК ЗЛЕВА, ТАК І СПРАВА!»

**Гэты жарт паходзіць з 20-х, 30-х гадоў мінулага стагоддзя. Замест звычайных: «Як жывеш?», «Як маешся?», «Як жыццё?», «Што ў цябе чуваць?» і г.д. сказалася: «Як справы?»**

А гэта штучная калька з рускай — «Как дела?», і ў народзе яна не ўжываецца.

Хоць «дело» па-беларуску нярэдка можна перакласці «справаю», аднак не заўсёды. Вазьміце рускі выраз «то и дело». Не перакладзеш яго «то і справа» — недарэчнасць. Трэба: **раз-пораз, раз за разам, сюд-туд, шторазу, беспераcтанку, увесь час** і інш.

Найбольш натуральна ў нашай мове слова **справа** гучыць у значэнні **вучэння, ідэй**. Мы ж не аднаго разу чулі і чыталі: ён быў адданым змагаром за справу Леніна. Гэтае слова добра гучыць у значэнні збору дакументаў, што адносяцца да нейкага факта ці асобы: асабовая справа. Адсюль і службовая пасада — **справавод**. Адсюль і **справаводства**.

Гэтакае ж месца займае яно і ў значэнні судовага разбору: судовая справа, крымінальная справа.

У такіх выпадках слова **справа** дарэчы.

Але цяпер яго пачалі ўжываць незвычайна шырока — як амаль поўную адпаведнасць рускаму **дело**. З-за абагуленасці рускага адпаведніка **справа** была вельмі папулярная ў свой час, калі гэтым словам добра было прыкрываць усялякі неакрэслены, няпэўны занятак, надаючы яму выгляд **работы**. Але ў жывой мове ў нас такое шырокае ўжыванне **справы** ўспрымаецца нечым штучным, наносным і нежывым.

Замест абагуленага назоўніка **дело** беларуская мова стараецца ўжыць канкрэтныя яго адпаведнікі. Нават у такім выразе — папка для спраў — што зусім правільна — лепш будзе, калі сказаць па-беларуску: **папка для папер**, **папка для дакументаў**.

Дык **первым делом** (найперш, перш за ўсё, перш-наперш, перадусім, сама перш, спярша) разгледзім збольшага гэтыя адпаведнікі.

Найчасцей за словам **дело**, вядома ж, устае **работа, праца**:

За дело! Да працы! (Не блытаць з выразам: за дело, поделом ему — па заслугах, справядліва, так яму і трэба.)

Приняться за дело — узяцца за работу.

Дел по горло — работы па вушы.

Падчас мову ажывіць блізкая прыказка, прымаўка:

Он занят делами по горло — Ходзячы есць, а стоячы спіць.

Але, вядома, калі гэта акурат стасуецца да таго, пра што гаворыцца.

Дела занимают много времени — работа адбірае шмат часу.

Занять учеников делом — даць вучням работу.

По делу будет видно — работа пакажа.

Без дела — (пра людзей) без работы, нічога не робячы, гуляючы. (Але аб рэчах: утварь лежит без дела — начынне ляжыць без патрэбы, без ужытку.)

Между делом — між работаю, мімаходзь, урыўкамі, прыхваткам.

Это легкое дело — гэта лёгкая работа, гэта лёгка зрабіць (у апошнім прыкладзе прыметнік замяняюць, як бачым, прыслоўем, а назоўнік — дзеясловам з падобным коранем).

Пры перакладзе **дела** ў значэнні роду заняткаў, спецыяльнасці, галіны ведаў ці навыкаў (разам з адпаведным азначэннем) ужываецца ў нас побач са **справаю, рамяством, майстэрствам** і цэлы шэраг спецыфічных назоўнікаў.

Гончарное дело — ганчарства.

Плотническое дело — цяслярства.

Наяўнасць такіх слоў у нашай мове, як ткацтва, кравецтва, мулярства, малярства, слясарства, кавальства, друкарства і г.д., дазваляе ў шмат якіх выпадках перадаваць падобныя рускія двухслоўныя выразы адным словам.

Часта **дело** абазначае **клопат, патрэбу, просьбу, інтарэс**. Тады яно і перакладаецца гэтымі словамі.

Без дела не входить — без патрэбы не заходзіць.

У меня к вам дело — у мяне да вас просьба.

Неотложное дело — пільная, крайняя, неадкладная просьба, патрэба.

Мое (твое, ваше и т.д.) дело — мой (твой, ваш і г.д.) клопат.

Не моего (твоего, нашего и т.д.) ума дело — не з маім (тваім, нашым і г.д.) розумам брацца за гэта, не мой (твой, наш і г.д.) клопат.

С каким делом? — З якой патрэбаю? (просьбаю, клопатам і г.д.) З чым прыйшлі? Што ў вас да мяне? — у залежнасці ад сітуацыі, ад яе атмасферы, ад тых людзей, што гавораць, могуць быць самыя розныя адценні такіх пытанняў.

А мне какое дело? — А мне які клопат? А мне што да таго? Гэта мне не абходзіць! От, наўда мне! А мне гэта ані ў пяце, ані ў галаве! А мне хоць трава не расці!

Вельмі важна правільна вычытаць, адчуць жывое напаўненне ў кожным канкрэтным разе слова **дело**: дзе яно азначае падзею, здарэнне, затрымку, судовы працэс, бітву, баталію і г.д.

Умно вести дело в суде — з розумам весці працэс.

В деле под Барановичами — у бітве пад Баранавічамі.

Темное дело — цёмная гісторыя.

Дело плохо — непярэліўкі.

Это наше дело — гэта наша задача.

Безвыходное дело — нявыкрутка, ніякага выйсця, ніякай рады, нічога не парадзіш, нічога не зробіш.

Правое, благородное дело — справядлівая, высокая мэта.

Наше дело правое! — Праўда на нашым баку!

Поймать на горячем деле — заспець на цёплым следзе.

Долгое дело — доўгая (вялікая) песня.

А на деле... — А напраўду (у жыцці, а тым часам...)

Щепетильное дело — далікатная рэч.

Вот в чем дело — вось у чым прычына, загвоздка.

Дело за вами — уся надзея на вас.

За мной дело не станет — затрымкі з-за мяне не будзе.

З-за сваёй абагульненасці **дело** можа ў беларускай мове замяняцца займеннікам. Бо, як вядома, гэтая часціна мовы можа падмяняць і назоўнік, і прыметнік, і лічэбнік. Таму такія займеннікі, як **усё, яно, гэта** і інш., могуць добра спатрэбіцца пры перакладзе шырока абагульненага **дела**.

Рассказал, как было дело — расказаў, як усё (яно, гэта) было.

Дело в том, что... — Усё ў тым, што...

Не дело говоришь — не тое кажаш.

К тому дело идет — на гэта яно ідзе.

Улажу дело — уладжу (зраблю) усё.

Дело пошло на лад — усё пайшло на лад.

Испортил дело — сапсаваў усё.

Тем дело и кончилось — на тым усё і скончылася.

Было дело — было такое...

У тебя ко мне срочное дело? — У цябе да мяне нешта тэрміновае?

Дело поправимое — гэта можна паправіць.

Это не дело — так нельга, так не выйдзе, сядзеш макам. Куды гэта варта?

Дела как есть — усё папраўдзе.

Пры перадачы часу, абставінаў нейкай падзеі, дзеяння **дело** можна замяніць на **гэта** або апусціць.

Дело было осенью — гэта было ўвосень.

Дело к ночи, пора возвращаться — блізка ноч, пара вяртацца.

Дело шло к вечеру — бралася на адвячорак, было надвечар.

І яшчэ. Нярэдка рускае **дело** ў спалучэнні з прыметнікам выступае як выказнік або пабочнае слова са значэннем якраз гэтага самага прыметніка. І таму гэтае **дело** ў перакладзе можна апусціць.

Главное дело — галоўнае.

Известное дело — вядома, што й казаць.

Нелегкое дело — нялёгка.

Это совсем другое дело — гэта зусім іншае.

Это дело не шуточное — гэта не жарт(ы), не жартачкі.

Страшное дело — проста страх, страх адзін.

А ўвогуле цяжка ў жывой мове ўсё скласіфікаваць, раскласці па нейкіх палічках. Цікава бачыць, якая разнастайнасць замены ў нашай мове — назоўнікі, прыметнікі, займеннікі, дзеясловы, прыслоўі... А багацце сінанімікі!.. Ёсць прастора для разгарнення!

Пераклад — з'ява творчая (дело творческое), ён не церпіць дагматычнай абавязковасці. Ды розныя людзі за пэўным сказам не заўсёды бачаць адзін і той жа кантэкст, можна аб нечым і паспрачацца. Але адно (одно дело) — адценні, а другое (другое дело) — памылкі, штучнасць, ненатуральнасць...

Напрыканцы яшчэ жменька прыкладаў з перакладамі **дела**, як гэта мне бачыцца.

В чем дело? — Што такое? Што сталася? Што здарылася? І той жа выраз, але ўжо не з пытальнікам, а клічнікам:

В чем дело! — Пра што вы кажаце (просіце)!

Вот так дело! — Вось дык маем!

Ближе к делу — без лішніх драбніц, карацей, не адхіляйцеся ўбок.

Да и в самом деле... — Ды яно і праўда... І сапраўды...

Ждем исхода дела — чакаем, чым скончыцца.

Это дело! — Гэта добра!

Есть такое дело! — Добра! Згода!

Он в курсе дела. — Ён ведае пра гэта.

Надо войти в суть дела — трэба разабрацца, што да чаго.

Дело твое — воля твоя — твой клопат, ты сам сабе гаспадар (пан), як ты хочаш, глядзі сам.

Дело говоришь — праўду кажаш, добра кажаш, во-во, твая праўда, слушна кажаш.

Войти в дело — стаць супольнікам, увайсці, уступіць у бізнэс.

Не предрешая дела... — Не забягаючы наперад.

Не суйся в чужие дела — не лезь не ў сваё.

Не берись не за свое дело — злазь з даху, не псуй гонтаў.

И дело с концом, и делу конец — на тым і канец.

**Рубрыку вядзе Анатоль КЛЫШКА.**

